Эсэ «Вялікая Айчынная вайна ў творчасці пісьменнікаў»

Казлова Вікторыя Аляксандраўна
ДУА “Ельская раённая гімназія”

Эсэ «Вялікая Айчынная вайна ў творчасці пісьменнікаў»

Жыта шчодрае косім,
Славім шчасця гады,
А гасцей усё возім
У Хатынь, у Хатынь.
На зямлі нашай светлай
Добра жыць і любіць.
Аб чацвёртым, чацвёртым
Мы не можам забыць.

П. Панчанка

Шчаслівы той народ, у мінулым якога не было трагічных момантаў, што вымагалі б ад яго масавага гераізму. Нават калі народ і вытрымлівае гэтае выпрабаванне, то ўсё роўна нясе вялікія страты. Гэтыя страты – знак бяды і для будучых пакаленняў, бо войны, стыхіі, эпідэміі вынішчаюць генафонд нацыі.

Трагічны лёс нашага народа, бо ў апошняй, самай жудаснай у гісторыі чалавецтва вайне самыя цяжкія выпрабаванні выпалі на долю беларусаў. Кожны трэці беларус загінуў у страшным полымі вайны. Гэтым і тлумачыць выдатны пісьменнік В. Астаф'еў тое, што «беларусы стварылі самую таленавітую і хвалюючую літаратуру пра вайну».

Беларусамі створана не толькі мастацкая, але і дакументальная літаратура пра Вялікую Айчынную вайну, бо з'явілася неабходнасць, каб пра ўсенародную трагедыю на «свет цэлы» сказаў сам народ, бо ніхто лепш не здолее расказаць пра яго пакуты, чым ён сам.

Дакументальныя кнігі Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», Алеся Адамовіча «Карнікі» сапраўды пацвярджаюць выказванне Канстанціна Сіманава, што ўсю праўду пра вайну «ведае толькі народ». У гэтых кнігах сабраны маналогі і пакутнікаў, якія цудам уратаваліся ў тым пякельным полымі вайны і сталі апошнімі яе сведкамі, і барацьбітоў са смерцю дзеля жыцця, і нават тых, як паказана ў кнізе «Карнікі», хто пераступіў праз запавет «не забі!».

Беларуская літаратура пра вайну не толькі засведчыла трагедыю народа і ўславіла яго подзвіг у выратаванні чалавецтва ад фашызму, але і даследавала прычыны сусветнай трагедыі. Тым самым яна папярэджвае ўсіх нас пра тое,
што лёс беларускіх Хатыняў мае агульначалавечае значэнне, што мінулае можа паўтарыцца, толькі ў горшым варыянце.

«Колькі талентаў звялося» ў гады вайны, а колькі, «раны не залячыўшы, рана паміралі»! І ці не ў гэтым адна з прычын нашых сённяшніх праблем, нашай бездухоўнасці? Адной з выяў бездухоўнасці з'яўляецца бяспамяцтва, якое Васіль Быкаў лічыць найбольшым злом у нашым жыцці. У імя памяці, пакуль не позна, трэба засведчыць трагедыю вайны, каб зноў не стаць яе ахвярамі.

Сёлета наш народ будзе адзначаць сумна-ўрачыстую дату – 77 гадоў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, святкаваць сямідзесяцішасцігоддзе Вялікай Перамогі. Яшчэ і ў XX1 стагоддзі пякучым

болем адзываецца найцяжэйшая з войнаў у сэрцы кожнага беларуса. Мы павінны не забываць пра жахі вайны, смерць і пакуты мільёнаў людзей, помніць аб вайне, гераізме і мужнасці тых, хто змагаўся з ворагам і выратаваў ад фашысцкага нашэсця Бацькаўшчыну – гэта абавязак усіх, хто жыве на зямлі. Помніць – гэта значыць не дапусціць разгортвання новай агрэсіі ў сучасных умовах. Менавіта пагэтаму тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адной з важнейшых у беларускай літаратуры.

Пра вайну напісана шмат твораў. Гэта аповесці В. Быкава («Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Сотнікаў», «Абеліск», «Воўчая зграя», «Знак бяды», «Сцюжа»), раманы А. Савіцкага («Літасці не чакай», «Памерці заўсёды паспееш», «Зямля не адкажа», «Верасы»), апавяданні Я. Брыля («Маці», «Memento mori»), раман-эпапея М. Лынькова «Векапомныя дні», шматлікія вершы беларускіх паэтаў.

Усе творы пералічыць немагчыма. Розныя па жанрах, яны ўсе аб'яднаны памяццю сэрца, моцным жаданнем уваскрасіць бессмяротныя подзвігі салдат, партызан і падпольшчыкаў, паказаць мірных жыхароў у выпрабаваннях вайны. Да тэмы вайны звяртаюцца пісьменнікі як старэйшага, так і малодшага пакаленняў.

Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін належыць да пакалення пісьменнікаў, маладосць якіх была апалена і загартавана вайной. Магчыма, па гэтай прычыне большасць яго твораў прысвечана ваенным падзеям.

У 1944 годзе І. Шамякін напісаў апавяданне «У снежнай пустыні», потым – аповесць «Помста» (1946). Па сведчанні самога пісьменніка, адсюль і пачынаецца яго творчы шлях. Аўтар жыў атмасферай вайны, таму зразумела, што і творы яго тэматычна звязаны з ваеннымі буднямі, прысвечаны салдацкай салідарнасці і ўзаемавыручцы. Іван Шамякін сваёй творчасцю гаворыць пра тое, што памяць – адказная і цяжкая ноша душы, аднак мы не павінны забываць пра подзвіг нашага народа, дзякуючы якому жывём зараз пад мірным блакітным небам.

Многія з удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны яшчэ жывуць сярод нас, і мы маем не шмат часу для таго, каб дазволіць ім сказаць свае словы гісторыі, якую яны некалі стваралі.

Наша Перамога вартая таго, каб ёй ганарыліся не толькі мы, але і нашы нашчадкі, людзі на ўсёй планеце, таму што гэта агульная Перамога ўсіх народаў над фашызмам. Памяць аб ёй павінна жыць у вяках, яна прызначана яднаць людзей на шляху да лепшай будучыні. На тое вельмі спадзяваліся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

9 Мая адзначаецца нашымі людзьмі як свята і асабістае, і сямейнае, і дзяржаўнае, і інтэрнацыянальнае. Зноў і зноў углядаемся ў падзеі Вялікай Айчыннай вайны, імкнемся глыбей зразумець значэнне бітваў, якія адбыліся на беларускай зямлі і адыгралі важную ролю на шляху да поўнай перамогі над фашысцкай Германіяй. Цяжкім быў гэты шлях. Памяць аб усіх, хто не вярнуўся з фронту, хто загінуў, абараняючы зямлю сваіх бацькоў, свяшчэнная. Яна вечная. Не будзе такой памяці – не будзе і дзяржавы. Як пісаў Анатоль Вярцінскі: «Жыць трэба, сябры мае, помнячы... »

Пісьменнікі ў сваіх творах расказваюць пра тыя жудасныя падзеі. Гэтым самым яны даюць нам магчымасць помніць сваю гісторыю, помніць пра тых, хто здабываў Перамогу. Кнігі пра вайну можна лічыць своеасаблівым помнікам загінуўшым. Яны вучаць нас мужнасці, адвазе, бясстрашнасці, шчырай адданасці Айчыне.

Нізка схіляючыся перад абеліскамі, ля якіх гарыць Вечны агонь, мы павінны разумець, што ён можа згаснуць навекі, калі згасне памяць нашых сэрцаў. А выявы яе – нашы канкрэтныя справы і найперш – мір і згода паміж людзьмі, паміж народамі.